**А.У. КАСЦЮКАВЕЦ**
Рэспубліка Беларусь, Узда, Уздзенскі цэнтр развіцця дзіцяці "Вясёлка"

# РАЗВІЦЦЁ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ВЫХАВАНЦАЎ 2–4-х ГАДОЎ СРОДКАМІ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Увядзенне.** У дашкольным ўзросце, найбольш спрыяльным перыядзе для развіцця асобы дзіцяці, павінна адбывацца актыўнае фарміраванне моўнага развіцця і навучанне моўнай культуры. Важным звяном у сістэме навучання дзяцей роднай мове з'яўляецца звязнае маўленне, якое якасна фарміруецца з адным са сродкаў навучання – мастацкай літаратурай і фальклорам.

Рэчаіснаць паказвае, што засваенне дзецьмі беларускай мовы адбываецца ў сітуацыі руска-беларускага двухмоўя. Паўнавартаснае беларускамоўнае асяроддзе ў дзяцей дашкольнага ўзросту, як правіла, адсутнічае. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што ў час, які мы жывем, бацькі выхаванцаў амаль не чытаюць сваім дзеткам кніг на роднай мове. Маленькія дзеці амаль не чуюць беларускае мастацкае слова.

Аналіз навуковай і метадычнай літаратуры айчынных аўтараў Н.С. Старжынскай, Дз.М. Дубінінай па абмеркаванай тэме паказвае, што авалоданне беларускай мовай складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці, станаўлення нацыянальнай самасвядомасці [8, с. 3]. Аўтары вызначаюць неабходнасць выхоўвання пачуцця беларускай мовы, ствараючы для гэтага адпаведныя маўленчыя ўмовы, у працэсе якіх, пад кіраўніцтвам выхавальніка, дзеці могуць засвоіць беларускую мову, вырашыць розныя маўленчыя задачы [8, с. 6]. Н.С. Старжынская вызначае, што паўнацэннае маўленчае выхаванне дзіцяці павінна адбывацца праз мастацкае слова, якое садзейнічае засваенню выразных багаццяў роднай мовы на ўзроўні чуцця і тым самым забяспечвае узбагачэнне духоўнага свету кожнага дзіцяці [6, с. 34].

**Мэтай** дадзенага артыкулу з'яўляецца далучэнне дзяцей малодшага ўзросту да выразных багаццяў роднай мовы, фарміраванне звязнага маўлення, уменне інсцэніраваць кароткія мастацкія творы з дапамогай адабраных эфектыўных сродкаў, метадаў і прыёмаў работы. Сістэма педагагічнай дзейнасці ажыццяўлялася на працягу 2-х гадоў.

На арганізацыйным этапе вывучалася і аналізавалася навуковая, метадычная літаратура па фарміраванні ўстойлівай цікавасці выхаванцаў дашкольнага ўзросту да беларускай мовы, да мастацкай літаратуры і фальклору.

На асноўным этапе ўзбагачалася развіваючае асяроддзе ў групе, у адукацыйным працэсе выкарыстоўваліся эфектыўныя метады і прыёмы работы з мастацкай літаратурай і фальклору для развіцця звязнага машлення дзяцей малодшага ўзросту. Развіццю моўнай культуры выхаванцаў і фарміраванню якаснага адукацыйнага працэсу садзейнічала створанае ў групе прадметна-гульнявое асяроддзе: куток кнігі з неабходным ілюстраваным матэрыялам: дзіцячай літаратурай, партрэтамі пісьменнікаў, дзіцячымі часопісамі, ілюстрацыямі да казак, апавяданнямі, кніжкамі-малышкамі, аўтарскімі казкамі, складзенымі бацькамі або выхавальнікам разам з дзецьмі. Мастацкі куток дазволіў дзецям выразіць свае ўражанні ад прачытанага твора сродкамі выяўленчай дейнасці.



Разнастайнае абсталяванне тэатральнага кутка: маскі, медальены, тэатральная атрыбутыка, міні-касцюмерная майстэрня, розныя віды лялечных тэатраў на асобныя творы мастацкай літаратуры і фальклору стваралі ўмовы для інсцэніравання прачытаных мастацкіх твораў. Вырашэнню намечаных задач садзейнічаў і аўтарскі многафункцыянальны дыдактычны дапаможнік-куфэрак "Домік казак і цудаў", аздоблены музычнымі інструментамі і ўнутры якога знаходзяцца розныя віды тэатраў, якія адлюстроўваюць праграмныя казкі.

Праца па фарміраванні ў дзяцей навыкаў разумення роднай мовы пачалася ў працэсе прывыкання да дзіцячага садка, з паступовага ўвядзення беларускага фальклору ў працэс штодзённых узаемаадносін, рэжымных момантаў, якія суправаджаліся пацешкамі,

калыханкамі, казкамі на роднай мове. У зносінах з дзецьмі выкарыстоўваліся апорныя словы (добрай раніцы, да пабачэння, дзякуй, калі ласка), што садзейнічала фарміраванню пачуццёвай асновы руска-беларускага двухмоўя.

Сістэматычная праца па фарміраванню цікавасці маленькіх выхаванцаў да мастацкіх твораў на беларускай мове праводзілася ў форме гульняў-заняткаў. Спачатку на занятках выкарыстоўваліся забаўлянкі, песенькі, калыханкі, пры расказванні якіх разгортвалася перад дзецьмі невялікае тэатралізаванае дзейства. Жывы расказ казак разам з паказам ствараў у выхаванцаў узнёслы настрой, абуджаў жаданне імітаваць дзеянні, уключацца ў гульнёвую сітуацыю. На занятках, дзе гучалі казкі, выкарыстоўваўся прыём пераўвасаблення. Гульнёвыя дзеянні прадугледжвалі абавязковае выкананне выхаванцамі, якія ўмелі ўжо гаварыць, маўленчых дзеянняў (назаві, паўтары, адкажы, палічы і інш.). Акрамя выразнага чытання твора, гульнёвых дзеянняў, выкарыстоўвалася паўторнае чытанне твора, асобных яго частак, тлумачэнне незразумелых слоў, дзякуючы чаму накапліваўся чытацельскі вопыт.

Паступова адукацыйны працэс з дзецьмі ажыццяўляўся ў нерэгламентаванай дзейнасці, дзе перавага аддавалася мастацка-маўленчай дзейнасці, чытанню і гутаркам паводле прачытаных мастацкіх твораў, разглядванню ілюстрацый, пераказу невялікіх мастацкіх твораў, завучванню вершаў. Пры знаемстве з казкай выкарыстоўвалася не проста чытанне, а аповед для лепшага разумення дзецьмі асноўнага сэнсу казкі. Невялікая па змесце казка паўтаралася па два-тры разы, часам паўтараліся толькі самыя яркія месцы. Пасля расказвання дзецям прапаноўвалася успомніць і пераказаць найбольш яркія моманты словамі казкі, што спрыяла лепшаму засвойванню тэксту. Каб пачутыя словы ўваходзілі ў актыўны слоўнік, выкарыстоўваўся прыем паўтарэння слоў у разнастайных спалучэннях. Фарміраванню граматычнага ладу маўлення садзейнічала спачатку перагаворванне асобных слоў, фраз, а потым гутаркі па зместу твора, якія дапамагалі вызначыць яго жанр, сродкі мастацкай выразнасці, дапамагалі зразумець асноўны змест. Напрыканцы першай малодшай групы выхаванцы маглі пераказаць невялікія ўрыўкі з казак, добра запаміналі некаторыя выразы, стараліся інтанацыйна перадаць словы некаторых персанажаў, а трохі пазней маглі інсцэніраваць малыя формы фальклору.

Бацькі маленькіх выхаванцаў падтрымалі педагігічныя ініцыятывы, сталі чытаць сваім дзеткам кнігі на роднай мове, прынялі ўдзел у пачатай дзіцячай бібліятэкай акцыі па "букросінгу". Прызнаюцца, што з нецярпеннем чакаюць, калі абмяняюць кнігу на новую. Дзякуючы падтрымцы бацькоў папоўнены кніжны куток групы беларускімі казкамі. Адгукнуліся бацькі і на конкурс стварэння аўтарскай казкі. Амаль усе бацькі выказвалі задаволенасць абраным накірункам працы.

**Заключэнне.** Ацэньваючы выніковасць праведзенай працы на заключным этапе, трэба адзначыць, што ў выхаванцаў чацвертага года жыцця ва ўмовах паслядоўнага сістэматычнага працэсу з выкарыстаннем эфектыўных сродкаў, метадаў і прыёмаў работы сфарміравалася цікавасць да беларускіх мастацкіх твораў, з'явіліся беражлівыя адносіны да кнігі, актывізавалася маўленчае выражэнне эмоцый, выказванняў, ўзбагаціўся слоўнікавы запас, сфарміраваліся добрыя моўныя магчымасці. Дзеці з ахвотай адказваюць на пытанні па змесце мастацкіх твораў на беларускай мове, з задавальненнем інсэніруюць кароткія творы на беларускай мове.

Спіс цытаваных крыніц:


1. Дубініна, Дз.М. Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратурыі фальклору: дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Дз.М. Дубініна. – Мінск: Новое знание, 2016. – 208 с.
2. Дубініна, Дз.М. Мастацка-маўленчае развіццё дашкольнікаў: дапаможнік для педагогаў устаноў, якія запяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Дз.М. Дубініна, Н.С. Старжынская; пад рэд. Н.С. Старжынскай. – Мінск: Зорны верасень, 2007. – 88 с.
3. Дубініна, Дз.М. Родныя вобразы ў паэтычным слове: для педагогаў устаноў, якія запяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі : у 2 ч. Ч.1 / Дз.М. Дубініна. – Мазыр: ТАА ВД «Белы Вецер», 2008. – 136 с.
4. Куксова, Н.А. Художественное чтение в детском саду: пособие для педагогов дошк. учреждений / Н.А. Куксова. – Минск.: Университетское, 2001. – 157 с.
5. Пралыгіна, Н.В. Гульні з лялькай: фарміраванне сацыяльнага вопыту і асабістых якасцей у дзяцей 3-га года жыцця сродкамі вуснай народнай творчасці ў гульнёвай дзейнасці / Н.В. Пралыгіна. – Мінск: Новое знание, 2015. – 40 с.

6. Старжынская, Н.С. Маўленчае і лінгвістычнае развіццё дашкольнікаў: дапаможнік для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Н.С. Старжынская. – Мінск: Зорны верасень, 2007. – 88 с.
7. Старжынская, Н.С. Народная цацка – люстэрка кальтуры: дапам. Для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання: з электрон. дад. / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мінск: Вышэйшая школа, 2014. – 87 с.
8. Старжынская, Н.С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў: дапам. Для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. – Мазыр: ТАА ВД «Белы Вецер», 2008. – 112 с.
9. Учебная программа дошкольного образования / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск: Нац. ин-т образования. 2019. – 480 с.

**А.А. КАШТОЛЬЯНОВА**
Республика Беларусь, Могилев, МГУ имени А.А. Кулешова

## ПРИМЕНЕНИЕ ЛЕГО-ТЕХНОЛОГИИ ПРИ ИЗУЧЕНИИ АРИФМЕТИЧЕСКОГО МАТЕРИАЛА В ПЕРВОМ И ВТОРОМ КЛАССАХ

**Введение.** Для наглядного представления математических понятий, выявления их свойств на первой ступени общего среднего образования традиционно применяются разнообразные учебные модели. Учебными моделями могут служить различные наглядные объекты, создаваемые с целью изучения определенного явления, выявления способа решения конкретной задачи. В качестве такой модели может использоваться конструктор Лего.

**Цель** исследования состоит в раскрытии методики применения конструктора Лего при изучении арифметического материала в первом и втором классах.

Перспективность применения Лего-технологии обусловливается ее высокими образовательными возможностями: многофункциональностью, техническими и эстетическими характеристиками, использованием в учебной и внеучебной деятельности. Применение конструктора Лего во время учебного процесса способствует повышению качества обучения, активности детей во время учебного процесса. Этот конструктор является наглядно-образной и наглядно-действенной моделями тех интеллектуальных операций, которые учащиеся производят в ходе учебной деятельности. Он развивает ориентирование в пространстве, логическое мышление, скорость реакции, мелкую моторику, память и внимание [1].

При изучении арифметического материала в I и II классах конструктор Лего позволяет учителю:

- иллюстрировать числа, считая каждый кирпичик единицей (непозиционный абак);
- объяснить, как образуются числа второго десятка, раскрыть особенности их названий и порядок следования при счете;
- наглядно представить разрядный состав двузначных чисел, рассматривая кирпичики двух цветов как единицы разрядов десятков и единиц (позиционный абак);
- осуществить арифметические действия над числами;
- показать приемы сложения и вычитания, в том числе с переходом через десяток;
- раскрыть свойства сложения и умножения [1].

С помощью кирпичиков Лего первоклассник может легко и осознанно усвоить основные приемы образования чисел путем добавления или удаления кирпичика (прибавление единицы к предыдущему числу или вычитание единицы из последующего числа). Разрядный состав чисел второго десятка сложен для понимания многих первоклассников. Учащемуся легче запомнить его, глядя на столбики, в которых десяток выделен цветом.

При использовании конструктора Лего как позиционного абака во втором классе учащиеся выполняют задание показать с помощью конструктора разрядный состав числа. При этом каждому цвету соответствует один разряд. После того, как учитель называет число, учащиеся берут кирпичики, которые соответствуют названному разряду, и набирают данное число на плате. Когда ученик справился с заданием, он поднимает плату, и учитель видит ответ ученика. Умение выявлять разрядный состав двузначных чисел формируется у учащихся также при выполнении задания назвать (записать) число, набранное учителем (соседом по парте) на плате с помощью кирпичиков двух цветов, размещенных в 2 столбика.